■ Фотаздымак з гісторыяй

# АБУЎ ВОРАГА Ў ЛАПЦІ

**Гарачае лета 1942 года. Вёска Камуна Любанскага раёна. 16-гадовы Мікалай са сваёй мамай і малодшым братам жывуць у часовай зямлянцы, пабудаванай непадалёк ад спаленага фашыстамі вясковага клуба. Вёску, апетую Янкам Купалам у паэме «Над ракой Арэсай», акупанты ператварылі ў папялішча яшчэ ў ліпені 1941 года.**


Берлін — 1945 год. Мікалай МАСКАЛЬЧУК (злева) з баявым сябрам.

Балюча і крыўдна было на душы Мікалая. Вось учора ноччу старэйшы брат са сваімі сябрамі пайшлі ў Петрыкаўскі раён, дзе базіраваліся атрады Палескага злучэння, каб уступіць у партызаны. Як ні прасіўся Мікалай, яго не ўзялі з сабой. Сказалі: «Яшчэ малы, ды і зброі ў цябе няма, які з цябе партызан? Сядзі пакуль дома, яшчэ паспееш навaявацца!» «Бацька на фронце з 1941 года, цяпер брат з сябрамі стануць партызанамі, а я чым горшы за іх?..» Думкі Мікалая перапыніў тупат конскіх капытоў. Проста да яго набліжаўся партызанскі атрад імя К. Каліноўскага (пазней гэты атрад увайшоў у склад 25-й брыгады імя П.К. Панамарэнкі). Байцы атрада былі ў добрым настроі. Напярэдадні яны правялі паспяховую аперацыю па знішчэнні паліцаяў у вёсцы Кузмічы, захапілі шмат зброі і не страцілі пры гэтым ніводнага салдата.

Мікалай рашуча падышоў да камандзіра: «Вазьміце мяне ў атрад, хачу біць фашыстаў!» — «Біць фашыстаў гэта не лёгкая, а вельмі небяспечная справа, хлопча, і гэтаму трэба вучыцца. А вучыцца цяпер няма калі», — адказаў той і залічыў Мікалая спачатку ў гаспадарчы ўзвод.


Пераход праз балота партызан брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі.

Шмат баявых аперацый правёў атрад імя К. Каліноўскага ў тыле ворага. Я хачу расказаць са слоў майго дзядзькі Мікалая толькі пра адну, праведзеную ў 1944 годзе непадалёк ад маёй роднай вёскі Камуна.

Нашай групе было строга загадана пасля захопу дзота адкрываць агонь па карніках, калі тыя ўсёй калонай уцягнуцца на грэблю і дойдуць да моста. Потым не затрымлівацца, хутка далучацца да галоўнага атрада.

«...Наш атрад заняў абарону ва ўрочышчы Забярвечча, за 600 метраў ад Камуны. Перад гэтым у пяць гадзін раніцы некалькі партызан (у тым ліку і я), пераапрануўшыся ў нямецкае адзенне, непрыкметна падкраліся да варожага дзота, які знаходзіўся на павароце дарогі на Сёмае. І пад выглядам змены каравула знішчылі двух кулямётчыкаў і вартавога. Самі ж замацаваліся ў гэтым дзоце.

«І асцярожна, каб вас свае не пабілі, не забывайце, якое на вас адзенне», — папярэдзіў нас камандзір.

А 8 гадзіне раніцы 3 лютага немцы пачалі наступленне. Нечакана для карнікаў наша група адкрыла агонь па хвасце калоны і з нямецкага дзота. У іх дзоце знаходзілася два кулямёты МГ-38 і поўныя скрыні патронаў.

Пасеяўшы паніку ў тыле калоны ворага і расстраляўшы нямала карнікаў, мы хутка пакінулі дзот і, прыхапіўшы два кулямёты і запасныя скрынкі з патронамі, злучыліся з галоўным атрадам. ...У выніку, панёсшы вялікія страты, фашысты павярнулі назад на Любань. Карная экспедыцыя была сарваная...»

У пачатку 1945 года Мікалай Маскальчук змагаўся ў складзе 286-й знішчальнай авіяцыйнай дывізіі бартавым стралком на самалёце-штурмавіку Іл-2-Д (двухмесны). Гэтай дывізіяй камандаваў палкоўнік Васіль Сталін (сын Сталіна). Воіны Чырвонай арміі называлі Іл-2 «лятаючым танкам», салдаты вермахта — «чумой» і «чорнай смерцю».

«Маёй задачай было абараняць самалёт ад нападу ззаду, — расказваў дзядзька. — Я знаходзіўся ў спецыяльнай кабіне з кулямётам. Звычайна мы грамілі ворага на вышыні 25—50 метраў. Убачыўшы наш самалёт над сваёй пазіцыяй, фашысты ў паніцы разбягаліся, хаваючыся ва ўкрыцце. Нам зусім не страшны быў агонь пяхоты, самалёт быў надзейна закрыты бранёй.

Часам нашы пілоты выкарыстоўвалі вонкавае падабенства Іла з нямецкім бамбардзіроўшчыкам Ju-87 (лапцёжнік) — шасі ў гэтага самалёта не ўбіралася і было падобнае на лапці. Нашы Ілы непрыкметна падляталі да нямецкіх самалётаў і знішчалі іх, але перад гэтым у паветры абавязкова выпускалі шасі. Гэты прыём называўся ў нашых пілотаў — абуць фашыстаў у лапці. З выпушчаным шасі наш самалёт здалёк амаль нічым не адрозніваўся ад нямецкага. На самалёце Іл-2 было магутнае ўзбраенне — дзве гарматы, два кулямёты, восем рэактыўных снарадаў, 600 кг бомбаў.

...2 мая 1945 года звяно нашых штурмавікоў знаходзілася ў небе над Берлінам. З вышыні птушынага палёту добра быў відаць палаючы Рэйхстаг. А над ім, на купале, чырвоны сцяг Перамогі. На душы было радасна, хацелася спяваць. У гэты дзень Берлінскі гарнізон капітуляваў...»

Мой дзядзька Мікалай Міхайлавіч узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За адвагу», «За перамогу над Германіяй». Пасля вайны ён працаваў у калгасе. Разам з жонкай выхавалі чацвярых дзяцей. На жаль, партызан і ветэраны стралок вельмі рана пайшоў з жыцця.

**Міхаіл МАСКАЛЬЧУК.**

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца*** ■

# Казачкі з антрэсоляў

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар. «СГ».)*

Пад жывую музыку адна за адной ажываюць і іншыя казкі як савецкіх, так і замежных аўтараў: «Пра пана Трулялінскага», «Вожык у калючым кажушку», «Мумі Троль у джунглях», «Цмок і чараўнік»... Увесь гэты працэс ахутаны нейкай магіяй... Нездарма праектар раней называлі «чароўным ліхтаром».

— Памятаю, калі я была маленькай, то з нецярпеннем чакала вечара, — расказвае пасля прагляду Наталля. — Тады тэлевізараў было мала, таму ў нашым пакоі (а мы жылі ў інтэрнаце сямейнага тыпу) збіраліся ўсе суседскія дзеці, каб глядзець разам дыяфільмы... Мне падабаўся сам працэс падрыхтоўкі да прагляду. Мама завешвала вокны, нацягвала на дзверы белую прасціну — своеасаблівы партал у казачны свет... Тата даставаў з шафы дыяпраектар, зараджаў у яго стужку... Хоць дыяфільмы засталіся ў мінулым, сучасныя дзеці з такой жа цікавасцю прыходзяць на кожны наш новы паказ, каб акунуцца ў цёплую атмасферу «аналагавага» чараўніцтва, пачуць новыя ці ўжо забытыя старыя казкі, паказаныя незвычайным для іх спосабам.

Наталля — супрацоўніца Цэнтра эксперыментальнай рэжысуры пры Акадэміі мастацтваў. Да дэкрэтнага водпуску рэалізоўвала там шэраг праектаў. Нараджэнне ж сына натхніла на новы — «Казачкі бай!».

— Спачатку разам з дзецьмі рабілі тэатр ценяў, — расказвае яна. — А потым, калі я знайшла стужкі з дыяфільмамі, прыйшла ідэя пераасэнсаваць казкі, якія тата чытаў у дзяцінстве, — шляхам незвычайнай агучкі.

**Калі ў вас раптам заваляласяя непатрэбная скрынка з дыяфільмамі ці ў вашай калекцыі ёсць некалькі аднолькавых стужак, «Казачкі бай!» будуць рады прыняць іх у дар, каб ажывіць іх на наступных паказах.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
Любімы дыяфільм сына Наталлі — «Муха-цакатуха».


Фота Дар'і ДЗЕМІДЗЕНКІ.
Падчас дарослага паказу «Казкі ў фармацэ 18х24», што прайшоў у кнігарні «Сон Гогаля».

Дзяўчына агучыла сваю ідэю, і яна знайшла водгук. Падтрымалі задумку Алена Гіранок з тэатра кінаакцёра, Антон Макуха з маладзёжнага тэатра, Дзмітрый Давідовіч з тэатра беларускай драматургіі, кінаакцёр Аляксандр Яфрэмаў, гітарыст Андрэй Еўдакімаў.

— Гэта як у тэатры. Напісана п'еса, а рэжысёр можа зрабіць нейкі новы арт-прадукт, прачытаць твор па-свойму. Мы робім штосьці падобнае. З аднаго боку, адраджаем тое, што было, з другога — ствараем новую форму, — кажа Андрэй Еўдакімаў. — Мы шмат імправізуем, вырашаем, з якой хуткасцю пераключаць кадры: на чым засяродзіць увагу, а дзе, наадварот, надаць рытм. Вырашылі ладзіць паказы асобна для дзяцей і для дарослых. Бо ёсць такія дыяфільмы, якія малым будуць незразумелыя. Напрыклад, павучальная грузінская народная казка «Разумная жонка». Мы закладаем асобны падтэкст — тое, што між радкоў можна прачытаць, — у тым ліку і ў музычную частку. Напрыклад, «Церамок» мы рабілі пад рэгі. Дзецям гэта будзе не зусім зразумела, таму тую ж казку для іх мы агучваем зусім па-іншаму.

— Раім прыводзіць дзяцей ад трох гадоў, — дадае Наталля, — бо па сваім сыне (а яму два гады) бачу, што дыяфільмы яго пакуль не цікавяць — цяжка засяродзіцца, сканцэнтравацца. Кліму цікава дастаць з каробачак стужкі, паразмотваць іх, пахадзіць перад ліхтаром — свае эксперыменты правесці. Адзінае, што ён глядзіць, — гэта «Муху-цакатуху», бо бачыць знаёмых персанажаў, чуе знаёмы тэкст.

— Бацькі пасля паказаў часта пытаюцца: «А дзе можна купіць гэтую штуку (маюць на ўвазе праектар)?» — працягвае Андрэй. — Папершае, раім зазірнуць у свае каморы і шафы, паглядзець на атрэсолях у сваякоў. Там можа быць шмат чаго цікавага. Па-другое, хапае аб'яў у інтэрнэце...

— Нядаўна я натрапіла на адну цікавую аб'яву. Мужчына прадае дзесці 300 дыяфільмаў. Вось гэта я разумею — калекцыя. У нас жа пакуль некалькі дзясяткаў стужак: тыя, што засталіся з майго дзяцінства, некалькі знайшла сярод рэчаў мужа і штук 15—20 прыдбала. Пераважная большасць — дзіцячыя казкі. Вельмі люблю гісторыю пра мумі-троляў. А таксама зрадніласся з брытанскім дыяфільмам «Дзе ж Вілі?». Ён вельмі стылёвы, чорна-белы.

***— Наталля, а ці ёсць у вашай калекцыі дыяфільмы на беларускай мове?***

— На жаль, няма. Я, калі праглядала ў інтэрнэце чыюсьці калекцыю, знайшла адзін дыяфільм на беларускай мове, навукова-пазнавальны, пра птушак. У Беларусі не было студыі, якая б выпускала дыяфільмы. Але затое ў нас, у Рагачове, выраблялі прафесійныя праектары. Цяпер мы ладзім паказы з праектарам для дамашняга прагляду, той што застаўся з майго дзяцінства. Марым пра прафесійны, з лепшай оптыкай, які нават пры лёгкім зацямненні дазваляе рабіць добры малюнак. У планах — папаўненне калекцыі дыяфільмаў. Я, напрыклад, вельмі хацела б агучыць «Калабка». Сябры прывозілі паказаць з Піцера, з субтытрамі на рускай і англійскай мовах. Дык у мяне адразу нарадзілася ідэя для гэтай стужкі.

Калі ў вас раптам заваляласяя непатрэбная скрынка з дыяфільмамі ці ў вашай калекцыі ёсць некалькі аднолькавых стужак, «Казачкі бай!» будуць рады прыняць іх у дар, каб ажывіць іх на наступных паказах. Дарэчы, дагэтуль сеансы праходзілі час ад часу, бо не так проста знайсці прыдатнае памяшканне. Але перад выхадам гэтага тэксту Андрэй паведаміў радасную навіну: кіраўніцтва музея-майстэрні Заіра Азгура пайшло насустрач, і цяпер паказы дыяфільмаў будуць ладзіцца рэгулярна, раз на месяц.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*dryla@zviazda.by*